# Gramática

## 1. Артыкль

Перад назоўнікамі жаночага роду, якія пачынаюцца на націскную **a** ці **ha**, у адзіночным ліку ўжываецца артыкль мужчынскага роду **el** альбо **un,** напрыклад, **el** ama de casa, **un** ama de casa, але **las** amas de casa.

### Адсутнасць артыкля

Артыкль не ўжываецца:

1) перад імёнамі і прозвішчамі:
Mi hermana se llama María López.

2) перад назоўнікамі, якія азначаюць частку ад цэлага:
Tomo un vaso de leche.

3) перад назоўнікамі, якія азначаюць прафесію, род заняткаў у іменнай частцы выказніка:
Mis padres son maestros.

## 2. Словаўтварэнне

### Суфіксацыя

| Суфіксы | Вытворная аснова | Вытворнае слова | Прыклады |
|---|---|---|---|
| **-ista** | назоўнік | назоўнік, які азначае прафесію, род заняткаў (муж. і жан. р.) | taxista, pianista |
| **-dor**<br>**-tor**<br>**-sor**<br>**-ero** | дзеяслоў<br>назоўнік | назоўнік муж. р., які азначае прафесію | pescador,<br>traductor,<br>defensor,<br>cocinero |
| **-dora**<br>**-tora**<br>**-sora**<br>**-era** | дзеяслоў<br>назоўнік | назоўнік жан. р., які азначае прафесію | profesora,<br>traductora,<br>defensora<br>cocinera |